УДК 947.6:355«1877/1878»

*С.А. Талмачова,*
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ*

# УДЗЕЛ ЖЫХАРОЎ ЗАХОДНІХ ГУБЕРНЯЎ У АКАЗАННІ ДАПАМОГІ РАСІЙСКАЙ АРМІІ ПАДЧАС РУСКА-ТУРЭЦКАЙ ВАЙНЫ 1877–1878 гг.

Руска-турэцкая вайна 1877–1878 гг. з'явілася важнай падзеяй агульнаеўрапейскай гісторыі. Значэнне яе вынікаў для ўсёй Еўропы цяжка пераацаніць і ў кантэксце міжнародных адносін дадзенага перыяду, і для далейшага развіцця дыпламатычных адносін паміж еўрапейскімі краінамі. Невыпадкова актуальнасць даследавання падзей Руска-турэцкай вайны з'яўлялася важнай не толькі ў перыяд самой вайны і ў першыя пасляваенныя гады, але і на сучасным этапе знаходзіць адлюстраванне ў шэрагу прац. У апошнія гады асобныя аспекты праблемы разглядалі С. Новікаў, А. Седзіна, Б. Сідарэнка, В. Чарапіца. Пры гэтым праблема ўдзелу жыхароў заходніх губерняў Расійскай імперыі ў падрыхтоўцы расійскай арміі да Руска-турэцкай вайны 1877–1878 гг. не была тэмай спецыяльнага і ўсебаковага даследавання.

Рост нацыянальна-вызваленчага руху народаў Балканскага паўвострава супраць турэцкага ўладальніцтва, а таксама ўмяшальніцтва еўрапейскіх дзяржаў у балканскія справы выклікалі ў сярэдзіне 70-х гг. XIX ст. «балканскі крызіс». Жорсткасць падаўлення красавіцкага паўстання 1876 г. у Балгарыі выклікала вялікі рэзананс у Еўропе і асабліва ў Расіі. У маі 1876 г. Расійская імперыя, Германія і Аўстра-Венгрыя падпісалі Берлінскі мемарандум, па якім Турцыя павінна была правесці рэформы для паляпшэння стану славянскага насельніцтва. Гэты дакумент падтрымалі Францыя і Італія, але не прызнала Вялікабрытанія. Урад Асманскай імперыі адказаў узмацненнем карных мер супраць славянскага насельніцтва на Балканах.

Вясной 1877 г., калі дыпламатычныя захады скончыліся безвынікова, у Пецярбургу было прынята рашэнне пачаць вайну супраць Турцыі. Царскі ўрад не жадаў дапусціць памяншэння свайго ўплыву ў Паўднёва-Усходняй Еўропе і на Блізкім Усходзе. 12 (24) красавіка 1877 г. Аляксандр II падпісаў маніфест аб абвяшчэнні вайны Асманскай імперыі. Насельніцтва заходніх губерняў горача адгукнулася на гэта. Многія сельскія грамады складалі лісты, адпраўлялі на імя цара тэлеграмы ў яго падтрымку [1].

Пачаўся збор ахвяраванняў: адзення, медыкаментаў, а таксама грошай для забеспячэння арміі. Нягледзячы на цяжкія эканамічныя ўмовы, сялянства знаходзіла магчымасць уносіць значныя сродкі для падтрымкі арміі. У прыватнасці, сяляне Віцебскай губ. прынялі грамадскія прыгаворы па валасцях аб ахвяраванні на карысць параненых у Руска-турэцкай вайне па 5, 10 і 15 кап. з душы. Сяляне Саўскай воласці Грыцкага павета Магілёўскай губерні вырашылі «прызначыць штогод да скančэння вайны на карысць Грамадства папячэння аб параненых і хворых воінах па 5 кап. з цягла», што складала з іх воласці 25 руб. 72 кап. Акрамя таго, сяляне Шавелеўскай і Світошыцкай валасцей таго ж павета вырашылі ўладкаваць тры ложкі для параненых у памяшканні валаснога праўлення [2, с. 79, 120].

У снежні 1877 г. у Віцебскай губ. ахвяраванні дасягнулі 72 тыс. руб., у Мінскай – звыш 41 тыс., у Магілёўскай – 17 тыс. У студзені-лютым 1878 г. жыхары Міншчыны сабралі яшчэ каля 7 тыс. руб. [3, с. 398; 4, с. 10]. Акрамя таго, было сабрана шмат адзення, пераважна кажухоў, якіх, за выключэннем ужо зрасходаваных, да пачатку 1878 г. на віцебскім складзе Чырвонага Крыжа знаходзілася «некалькі соцень штук». Па звестках начальніка Віцебскага жандарскага ўпраўлення В.Я. Шахаўскога, пераважная большасць грошай, ахвяраваных у Віцебскай губ. на карысць Чырвонага Крыжа, паступіла ад сялянскіх грамад, «якія, незалежна ад уласных ахвяраванняў, выдзялялі па прыгаворах вядомую частку… мірскіх капіталаў». Другое месца па колькасці грошай пасля сялянскіх грамад займалі чыноўнікі і памешчыкі [2, с. 398].

Адной з галоўных прычын Руска-турэцкай вайны была абвешчана неабходнасць абароны і дапамогі хрысціянам, аднаверцам, якія цярпелі жорсткія адносіны з боку турак-мусульман. Таму Праваслаўная царква не магла застацца ў баку. На працягу 1877 г. ад духавенства толькі Мінскай епархіі паступіла каля 1,7 тыс. руб. У час гэтай акцыі паступіла 64 ахвяраванні ад прыхаджан сабораў, цэркваў і парафій Мінскай губ. Найбольш значным было ахвяраванне ад мінскага духавенства, якое склала каля 370 руб. Сярод асобных трэба адзначыць ахвяраванне ў суме 150 руб. ад палкоўніка Пяўцэвіча. Ахвяраванні паступалі і ў форме адлічэння ад месячнага заробку, напрыклад, работнікі Мінскай духоўнай семінарыі ў чэрвені-ліпені такім чынам унеслі звыш 25 руб. [3, с. 13].

Акрамя ахвяраванняў грашыма і адзеннем, была шырока распаўсюджана такая форма дапамогі, як бязвыплатная перавозка прызыўні-

коў. У прыватнасці, міравы пасрэднік 1-га ўчастка Бабруйскага павета у маі 1877 г. паведамляў мінскаму губернатару В.І. Чарыкаву, што сяляне чатырох валасцей яго ўчастка (Бацэвіцкай, Любоніцкай, Брожскай і Чэрпінскай) адмовіліся ад платы за перавозку прызыўнікоў на зборны пункт ў г. Бабруйск, ахвяраваўшы гэтыя грошы на патрэбы параненых і хворых воінаў, аб чым склалі прыгаворы валасных сходаў. У Саўскай валасці Горыцкага павета Магілёўскай губерні было вырашана для праезду праз іх тэрыторыю параненых і хворых салдат даваць бясплатныя падводы [2, с. 79, 120].

Шмат увагі ў заходніх губернях надавалася стварэнню шпіталяў, фарміраванню санітарных атрадаў. У Віцебскай губерні на народныя сродкі было адкрыта 8 шпіталяў на 255 ложкаў для лячэння параненых у Руска-турэцкай вайне, у Мінскай – 3 на 185 ложкаў, у Магілёўскай – на 73 ложкі, у Гродзенскай – 2 на 70 ложкаў [4, с. 10].

Падчас вайны беларускія ўрачы і медыцынскія сёстры (сёстры міласэрнасці) аказвалі вялікую дапамогу параненым і хворым салдатам і афіцэрам. На лячэнні ў шпіталях у заходніх губернях знаходзіліся салдаты 9-й дружыны Балгарскага апалчэння. Медыцынскі персанал працаваў з вялікім энтузіязмам. Перадавая інтэлігенцыя, моладзь імкнулася быць непасрэднымі ўдзельнікамі вайны, таму ў Віцебску і Полацку пры гарадскіх бальніцах адкрыліся курсы сёстраў міласэрнасці, куды дабрачынна запісаліся 30 чалавек. Курсы былі таксама адкрыты ў Мінску, Магілёве і іншых гарадах краю [4, с.10].

У Мінску, Магілёве, Віцебску, Гродне мясцовыя арганізацыі Чырвонага Крыжа збіралі дабрачынныя санітарныя атрады, укамплектаваныя медыцынскім персаналам. Асабліва праявіў сябе атрад сясцёр міласэрнасці, сфарміраваны ў Магілёве. У студзені 1878 г. на Балканы адправіўся Віцебскі санітарны атрад з 60 чал. Ён адыграў вялікую ролю ў барацьбе з эпідэміяй тыфу ў Паўночнай Балгарыі [4, с. 11].

З Мінска, Віцебска, Слуцка, Пінска і іншых гарадоў адпраўляліся дабравольцы. Аб маштабнасці гэтага руху сведчыць службовае данясенне, у якім падкрэслівалася, што «з Мінскай губерні ў Маскву прыбыла вялікая колькасць людзей, якія жадалі адправіцца на Балканы» [9, с. 361].

Сяляне заходніх губерняў аказвалі дапамогу сем'ям салдат у апрацоўцы іх зямель. Так, сяляне-ўладальнікі Саўскай і Горыцкай валасцей Горыцкага павета Магілёўскай губерні вырашылі «апрацаваць грамадой, засеяць і сабраць ураджай, накасіць сена» тым сем'ям салдат, якія мелі ворыўныя і пашавыя землі [2, с. 120].

Некаторыя сельскія грамады бралі на сябе ўплату выкупных плацяжоў і мірскіх павіннасцей за зямлю, якая належала сем'ям салдат, прызваных у дзеючую армію. Такія рашэнні, у прыватнасці, былі прыняты ў Саўскай, Горыцкай, Шавелеўскай і Світошыцкай валасцях Горыцкага павета Магілёўскай губерні [2, с. 120].

Урад таксама імкнуўся падтрымаць сем'і прызыўнікоў, але не за дзяржаўныя сродкі. Так, 25 чэрвеня 1877 г. Дзяржаўны Савет прыняў пастанову «Аб даглядзе сем'яў чыноў запасу і ратнікаў Дзяржаўнага апалчэння, прызваных у ваенны час на службу». Абвяшчалася за кошт гарадскіх і земскіх сродкаў абавязковае забеспячэнне сем'яў апалчэнцаў, якія не мелі сродкаў для існавання, бясплатным жыллём і прадуктамі харчавання (у колькасці 1 пуд 25 фунтаў мукі, 10 фунтаў круп і 4 фунты солі штомесяц на чалавека) [2, с. 453].

Да пачатку вайны армія Расійскай імперыі знаходзілася ў працэсе рэфармавання. У прыватнасці, быў здзейснены паступовы пераход да тэрытарыяльнай сістэмы ваеннага кіравання праз стварэнне ваенных акруг. У 1862 г. узніклі Варшаўская, Віленская, Кіеўская акругі, у 1864 г. – Рыжская, Пецярбургская, Фінляндская, Маскоўская, Харкаўская і інш., у якія ўвайшлі 45 губерняў і адна воласць (Бесарабская) Еўрапейскай Расіі і губерні Прывіслінскага краю. Да 1867 г. было ўжо пятнаццаць акруг, а ў 1870 г. Рыжская акруга была скасавана, а яе тэрыторыя падзелена паміж Пецярбургскай і Віленскай. Раёны ўнутраных акруг (Маскоўская, Харкаўская, Казанская) былі большымі па памерах, таму што мелі больш зручныя шляхі зносін, а колькасць войскаў у іх была нязначнай [5, с. 359–360].

Землі сучаснай Беларусі ўваходзілі ў склад Віленскай і Варшаўскай акруг. У Руска-турэцкай вайне баявыя адзінкі, створаныя тут, праявілі сябе вельмі актыўна.

Да канца лютага 1877 г. былі сфарміраваны 9 корпусаў, у тым ліку II і IV армейскія корпусы. У іх склад, акрамя іншых, уваходзілі 16 і 26-я пяхотныя дывізіі і 26-я артылерыйская брыгада, якія дыслацыраваліся ў Магілёве і Магілёўскай губерні. У Гомелі размяшчалася 16-я артылерыйская брыгада, а 30-я пяхотная дывізія і 30-я артылерыйская брыгада – у Мінску [6, с.190–192].

Расійскі ўрад прымаў неабходныя захады для прывядзення арміі ў баявую гатоўнасць. Мабілізацыя войскаў ажыццяўлялася паступова, у залежнасці ад ускладнення палітычнай сітуацыі. У жніўні планавалася абмежавацца мабілізацыяй усяго двух корпусаў. Аднак у хуткім часе зразумелі нязначнасць воінскага кантынгенту, з якім Расія меркавала выступіць. У лістападзе 1876 г. пачалася мабілізацыя 20 пяхотных дывізій. У 1877 г. у розны час было мабілізавана яшчэ 16 пяхотных дывізій і сфарміравана 52 рэзервовыя батальёны.

Памочнік начальніка жандарскага ўпраўлення Аршанскага і Сенненскага паветаў Магілёўскай губерні В.А. Бяссонаў адзначаў, што прызывы былі «выкананы сялянамі лёгка». «Часовае незадавальненне ўзбудзіў прызыў апалчэнцаў», праведзены па ўказе Аляксандра II ад 10 ліпеня 1877 г., у адпаведнасці з якім падлягала мабілізацыі частка апалчэнцаў для папаўнення запасных і рэзервовых часцей. У еўрапейскіх губернях імперыі і на Каўказе планавалася прызваць 188,6 тыс. ратнікаў першага разрада. Прызыў апалчэнцаў праводзіўся ў жніўні, у час палявых работ, без уліку льгот па сямейным стане, што выклікала масавае незадавальненне насельніцтва, галоўным чынам сялянства. Спецыяльным распараджэннем ад 16 жніўня 1877 г. урад вымушаны быў вызваліць незаконна прызваных апалчэнцаў. Гэта, па словах В.А. Бяссонава, «было прынята з падзякай і скончыла хваляванне» [2, с. 316, 453; 7; 8].

У 1878 г. мабілізацыя дайшла ўжо амаль да ўсіх мясцовых і нанава сфарміраваных рэзервовых і запасных войскаў. Гэта была першая мабілізацыя, праведзеная па даволі шырока распрацаваным плане. Склад дзеючай арміі і месца яе дыслакацыі былі ўсталяваны не адразу, а змяняліся ў залежнасці ад ходу дыпламатычных перагавораў і высвятлення магчымасцей турэцкай арміі. Значнае ўмацаванне расійскай арміі адбылося ўжо пасля абвяшчэння вайны, калі ў яе склад, акрамя 8, 9, 11 і 12-га карпусоў былі ўключаны яшчэ 4, 13 і 14-ы [5, с. 407–408].

У выніку дадатковай мабілізацыі 3 красавіка 1877 г. склад часцей, сфарміраваных на сучаснай тэрыторыі Беларусі, якія дзейнічалі пазней на Балканах, быў наступным: 16-я і 30-я пяхотныя дывізіі, кожная з якіх мела 12 батальёнаў у 13 293 чал. (усяго 24 батальёны колькасцю 27 586 чал.), а таксама 16-я і 30-я артылерыйскія брыгады – кожная складалася з 48 гармат і 1 728 чал. [6, с. 220].

Да часу абвяшчэння вайны – 12 красавіка 1877 г. – у Мінску размяшчаўся штаб IV армейскага корпуса, у які ўваходзілі 117-ы і 118-ы пяхотныя палкі 1-й брыгады і 119-ы і 120-ы пяхотныя палкі 2-й брыгады. У Магілёве дыслацыраваліся 16-я пяхотная дывізія (штаб і дывізіённы лазарэт), штаб 1-й брыгады, 61-ы і 62-гі пяхотныя палкі. 16-я артылерыйская брыгада дыслацыравалася ў Гомелі, 4-ы гусарскі полк (уваходзіў у склад 4-й кавалерыйскай дывізіі) – у Нясвіжы. З 19 па 25 чэрвеня ўсе названыя часці перайшлі мяжу і далучыліся да IV армейскага корпуса дзеючай арміі [6, с. 247–252].

Акрамя названых фарміраванняў, ужо 3 красавіка 1877 г. у склад 14-й пяхотнай дывізіі дзеючай арміі (галоўная кватэра ў Кішынёве) уваходзіў 54-ы Мінскі пяхотны полк. У адпаведнасці з загадам Аляксандра II ад 19 лютага 1877 г., у склад дзеючай арміі ўвайшлі і мясцовыя войскі, у прыватнасці, Віцебскі, Мінскі і Магілёўскі палкі, кожны з якіх складаўся з аднаго батальёна па 579 чал., а таксама Бабруйскі крапасны полк [6, с. 220–221].

У выніку правядзення дадатковай мабілізацыі 3 красавіка 1877 г. у Віцебскай губ. з 9 917 запасных чыноў было прызвана 6 140 чал., у Мінскай з 13 056 – 4 497 чал., а ў Магілёўскай з 10 888 – 6 855 чал. (усяго – 17 492 чал.) [6, с. 222]. Акрамя таго, вялікая колькасць жыхароў заходніх губерняў служылі ў арміі па папярэдніх прызывах. Ураджэнцы Беларусі ваявалі ў складзе 117-га Яраслаўскага, 118-га Шуйскага, 119-га Каломенскага, 120-га Серпухаўскага, Мінскага і Магілёўскага пяхотнага палкоў, Беларускага гусарскага палка, Валынскага, Суздальскага, Казанскага і іншых палкоў [4, с. 11]. Камплектаванне арміі не вялося толькі па тэрытарыяльнай ці нацыянальнай прыкмеце. Аднак у названых баявых адзінках, якія напярэдадні і ў час мабілізацыі дыслацыраваліся ў Паўночна-Заходнім краі, пераважную большасць складалі менавіта жыхары заходніх губерняў.

Канфіскавалі ў насельніцтва і коней. Ваенна-конская павіннасць адносілася да абавязковых у ваенны час. Пастаўцы ў войска падлягалі ўсе годныя да ваеннай службы коні, падводы і збруя за нешматлікімі выключэннямі. Жыхары заходніх губерняў толькі па прызыве 3 красавіка 1877 г. паставілі 2 441 коней, з іх толькі 22 ў перыяд паступілі па жэраб'ю [6, с. 224].

Такім чынам, жыхары вышэйадзначаных губерняў унеслі значны ўклад у фарміраванне арміі Расійскай імперыі падчас Руска-турэцкай вайны, а многія з іх аддалі сваё жыццё за вызваленне іншых народаў ад турэцкага прыгнёту.

### Літаратура і крыніцы

1. Национальный исторический архив Беларуси в Минске. – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 2815. Копии приговоров сельских сходов Минской губернии о выражении верноподданнических чувств Александру II.
2. Освобождение Болгарии от турецкого ига: документы. В 3 т. / под ред. С.А. Никитина, Д.К. Косева и др. – Т. 2. Борьба за национальное освобождение Болгарии в период Русско-турецкой войны. – М.: Наука, 1964.
3. *Новікаў, С.* Беларусы і балгары праз стагоддзі / С. Новікаў // Беларусь – Балгарыя: мост праз стагоддзі: матэрыялы канф. маладых вучоных. – Мінск: Беларускае таварыства дружбы і культурных сувязей з замежнымі краінамі. Таварыства «Беларусь – Балгарыя», 1999. – С. 13–17.
4. *Седзіна, А.* Беларусы ў змаганні за свабоду і незалежнасць Балгарыі / А. Седзіна // Беларусь – Балгарыя: мост праз стагоддзі: матэрыялы канф. маладых вучоных. – Мінск: Беларускае таварыства дружбы і культурных сувязей з замежнымі краінамі. Таварыства «Беларусь – Балгарыя», 1999. – С. 10–12.
5. *Дружинин, К.И.* Русско-турецкая война 1877–1878 гг. / К.И. Дружинин // История русской армии. – М.: ООО «Издательство АСТ»; СПб.: ООО «Издательство «Полигон», 2004.
6. Сборник материалов по Русско-турецкой войне 1877–1878 гг. на Балканском полуострове. В 96 вып. Вып. 11. Мобилизация русской армии и сосредоточение в Бессарабии. Издание Военно-Исторической Комиссии Главного Штаба. – СПб.: Военная типография (в здании Главного Штаба), 1898.

7. Правительственный вестник. – 1877. – 18 авг.
8. Сборник материалов по гражданскому управлению и оккупации в Болгарии в 1877–78–79 гг. В 6 вып. / под ред. генерал-майора Н.Р. Овсяного. – СПб.: Издание Военно-исторической комиссии Главного управления Генерального штаба, 1903–1907. Вып. 3.
9. Освобождение Болгарии от турецкого ига: документы. В 3 т. / под ред. С.А. Никитина, Д.К. Косева и др. – Т. 1. Освободительная борьба южных славян и Россия. 1875–1877 / под ред. С.А. Никитина, В.Д. Конобеева, А.К. Бурмова. – М.: Наука, 1961. – 716 с.

SUMMARY

*In the article on the basis of a wide range of sources the forms of assisting the Russian Army by the population of the North-Western Krai are described. These forms are collecting money, clothing and medicines for the Army provision, creating hospitals, establishing medical detachments, etc., as well, as the forms of assisting solders families by the fellow-villagers and the state. The article focuses on the reflection of the process and results of the military mobilization and the storage of military items created on the Krai's territory.*

Паступіў у рэдакцыю 29.04.2010 г.

*УДК [930:792]«193/198»*

***Т.І. Палікоўская,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры эканамічнай гісторыі БДЭУ*

# ГІСТОРЫЯ СТАНАЎЛЕННЯ ШКОЛЬНАГА ЕЗУІЦКАГА ТЭАТРА Ў БЕЛАРУСІ Ў АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ 30–80-х гг. ХХ ст.

На сённяшні дзень даследчыцкая праблематыка як адзін з аспектаў гістарыяграфіі, якая накіравана на вывучэнне навуковага пазнання гістарычнага мінулага, амаль не распрацавана беларускімі вучонымі. Тэмпы назапашвання комплексу навуковых даследаванняў па гісторыі Беларусі, рост інавацыйнага тэарэтычнага арсенала патрабуе ад даследчыкаў пераасэнсавання гістарыяграфічнай сітуацыі. Традыцыйныя тэарэтычна-метадалагічныя кірункі гістарыяграфіі вычэрпваюць свае магчымасці для рэалізацыі новых задач гістарычнай навукі XXI ст. – звароту да ўзроўняў «мікрагісторыі», вывучэння духоўнай, культурнай сферы грамадства, раскрываючы нацыянальныя асаблівасці праз паўсядзённае жыццё людзей. Антрапалагізацыя гісторыі вядзе за сабой змяненні ў прадметнай сферы даследаванняў. Раней забытыя тэмы гісторыі рэлігіі, культуры і асветы, у тым ліку гісторыя станаўлення школьнага тэатра езуітаў на беларускіх землях, становяцца актуальнымі ў свеце сацыяльна-антрапалагічнага падыходу.

Гісторыя станаўлення школьнага езуіцкага тэатра ў Беларусі у айчыннай гістарычнай навуцы 30 – 80-х гг. ХХ ст. як аб'ект асобнага даследавання не абіралася для спецыяльнага глыбокага вывучэння. Толькі некаторыя аспекты дадзенай тэмы закраналіся ў выданнях беларускіх навукоўцаў у кантэксце даследавання гісторыі палітыкі Ватыкана на беларускіх землях. Манаполія дыялектыка-матэрыялістычнага тлумачэння айчыннай гісторыі на многія гады вызначыла матэрыяльнае жыццё грамадства ў якасці асновы духоўнага жыцця. Даследаванне гістарычнага працэсу як супярэчнасці спосабу вытворчасці матэрыяльных даброт, пакідала за рамкамі вывучэння цэлы шэраг аспектаў гісторыі культурнай дзейнасці чалавецтва. Такім чынам, дадзены перыяд айчыннай даследчай работы гісторыі дзейнасці езуітаў у сферы культуры перажываў заняпад і характарызаваўся як крызісны.

У артыкуле зроблена спроба вызначыць стан і праблемы айчыннай гістарыяграфіі 30 – 80-х гг. ХХ ст., што ў сваю чаргу дазволіць выявіць тэндэнцыі працэсу развіцця дадзенай праблемы і паставіць на навуковыя рэйкі. Разглядаемы намі перыяд айчыннай гістарыяграфіі быў характэрны з'яўленнем першых буйных навукова-гістарычных работ па гісторыі Каталіцкай царквы ў Беларусі Я.Н. Мараша – вядучага айчыннага гісторыка палітычнай і сацыяльна-эканамічнай дзейнасці ордэна езуітаў у Беларусі [1 – 6]. Гістарычныя аспекты існавання школьнага езуіцкага тэатра былі разгледжаны Я.Н. Марашам фрагментарна. Тэатральная дзейнасць езуітаў у Беларусі ацэньвалася ім у якасці дапаможнага выхаваўча-навучальнага матэрыялу, сродку ідэалагічнага ўздзеяння на народ, спосабу прыцягнення на свой бок «класа мяшчан», а таксама ў якасці «баявой зброі» супраць іншаверцаў [1, с. 174]. У выніку назіраецца безальтэрнатыўнасць гістарычнай думкі даследчыка ў дачыненні да дадзенага пытання: абгрунтаванне мэт асветніцкай справы езуітаў сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі існавання Каталіцкай царквы і ордэна ў Беларусі як часткі палітыкі акаталічвання і паланізацыі яе праваслаўнага насельніцтва.

Праблема гісторыі станаўлення школьнага езуіцкага тэатра ў Беларусі знайшла сваё адлюстраванне ў шматтомным выданні пачатку 60-х гг. ХХ ст. – «Тэатральная энцыклапедыя» [7]. Нягледзячы на багатую дакументаваную базу, інфарматыўнасць артыкула выдання мела тыповую ідэалагічную зададзенасць, якая зыходзіла з навязвання канцэптуальна выражаных ацэнак дзейнасці ордэна езуітаў у сферы культуры. Так, аўтарская група ў сваіх высновах надала сцэнічнай справе ордэна прапагандысцкую і дагматычную функцыю Каталіцкага кас-